Прыёмная кампанія — 2020

# Рэгістрацыя на ЦТ — праз электронныя заяву і чаргу


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**2 мая ў краіне распачынаецца рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. Але ў сувязі з напружанай эпідэміялагічнай сітуацыяй парадак рэгістрацыі сёлета змяніўся.**

Заявы абітурыенты будуць адпраўляць на электронную пошту. Форма заявы для ўдзелу ў ЦТ (на рускай і беларускай мовах) размешчана на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (РІКВ) па адрасе www.rikc.by.

Заява павінна быць запоўнена ў электронным выглядзе ў адпаведнасці з патрабаваннямі інструкцыі і даслана з асабістага электроннага адраса абітурыента ў перыяд з 2 мая да 1 чэрвеня (да 18.00) на адрас электроннай пошты аднаго з пунктаў рэгістрацыі абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ. Адрасы электроннай пошты пунктаў рэгістрацыі, куды неабходна адправіць заяву, таксама размешчаны на сайце РІКВ.

Пункт рэгістрацыі ў тэрмін не пазней за адзін рабочы дзень з моманту атрымання заявы ад абітурыента адпраўляе на адрас яго электроннай пошты асабісты рахунак для ўнясення платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ (акрамя льготнай катэгорыі грамадзян).

Абітурыент, выкарыстоўваючы асабісты рахунак, павінен да наведвання пункта рэгістрацыі ўнесці не пазней за 1 чэрвеня плату за прыём і афармленне дакументаў праз сістэму «Разлік» (АРІП). Гэта сума складае 0,1 базавай велічыні за адзін вучэбны прадмет (2,7 рубля).

Каб пазбегнуць масавага збору людзей, пункты рэгістрацыі арганізуюць папярэдні запіс (фарміруюць электронную чаргу), што дасць магчымасць вызначыць дату і час наведвання абітурыентамі пунктаў рэгістрацыі.

Пасля аплаты абітурыент павінен у прапанаваны яму час асабіста забраць пропускі, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць яго асобу (пашпарт, від на жыхарства, пасведчанне бежанца) або даведку, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, таксама запаўняюць анкету і адпраўляюць яе на адрас электроннай пошты пункта рэгістрацыі. А пасля ў вызначаны ім час асабіста наведваюць гэты пункт, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць іх права на льготу.

**Працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропускаў.**

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш чым на чатыры дысцыпліны. Такім чынам, у іх ёсць магчымасць «ракіроўкі» пры паступленні на роднасныя спецыяльнасці.

Пры жаданні можна памяняць прадметы для здачы на ЦТ. Калі заява адпраўлена, а рэгістрацыя яшчэ ідзе, то пра сваё рашэнне абітурыент павінен паведаміць, калі прыйдзе ў пункт рэгістрацыі. Калі пропускі ўжо на руках, то давядзецца зноў забіраваць дату і час наведвання пункта рэгістрацыі, у якім яны былі афармлены, і асабіста перарэгістравацца.

**Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ.** Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. Сертыфікат удзельніка ЦТ таксама трэба запаўняць на той мове, на якой падавалася заява.

У кожным пункце рэгістрацыі арганізавана работа гарачай лініі для інфармацыйнай падтрымкі абітурыентаў па ўсіх пытаннях рэгістрацыі і праходжання ЦТ.

Як паведамлялася раней, у Міністэрстве адукацыі цяпер абмяркоўваецца магчымасць пераносу тэрмінаў правядзення ўступнай кампаніі. «Ва ўсякім разе, пакуль будземназіраць за той сітуацыяй, якая разгортваецца», — паведаміў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** Паводле яго слоў, плануецца збіраць у аўдыторыях менш людзей і ўзмацніць санітарную апрацоўку памяшканняў. Электронная рэгістрацыя на ЦТ таксама скіравана на тое, каб зменшыць колькасць наведванняў абітурыентамі пунктаў рэгістрацыі на ЦТ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Выратавала тое, што бацьку своечасова шпіталізавалі»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У бальніцы мужчына некалькі дзён знаходзіўся ў аддзяленні. Пры гэтым усе ўрачы працавалі ў поўнай ахове — у спецкасцюмах, рэспіратарах і акулярах. Першы яго тэст на COVID-19 быў адмоўны. Тым не менш трымалася высокая тэмпература, і ўрачы, западозрыўшы каранавірусную інфекцыю, перавялі яго ў рэанімацыю.

— Я мяркую, што такім чынам яны вырашылі падстрахавацца. Бо стан бацькі не пагаршаўся, — расказвае Вераніка. — Праўда, гарачка ў яго трымалася 13 дзён — у асноўным каля 38,5. Аднойчы раніцай ён напісаў нам, што ноччу ледзь не «згарэў» — так падскочыла тэмпература. Яго пракалолі, і толькі пасля гэтага яна пачала падаць. У рэанімацыі тату не падключалі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, толькі працягвалі даваць кісларод і трымалі пад кропельніцай.

Паўторны тэст у мужчыны аказаўся станоўчы. У сям'і ўпэўнены, што ён заразіўся на рабоце — працуе ў адной з будаўнічых арганізацый.

— Як толькі бацька трапіў у бальніцу, яму патэлефанавалі і паведамілі, што ён — кантакт другога ўзроўню. Яго калега доўга кашляў, потым пайшоў на бальнічны, з паліклінікі яго забрала «хуткая». А бацька з ім кантактаваў.

Пасля станоўчага тэсту мужчыну адразу перавялі ў інфекцыйную бальніцу.

— На той час у СМІ было шмат інфармацыі, нібыта ў бальніцах няма месцаў. А тата некалькі першых дзён быў адзін у трохмеснай палаце, — кажа Вераніка.

Цяпер ён працягвае лячэнне ў інфекцыйнай бальніцы. І, па словах дачкі, адчувае сябе добра і хоча дадому. Але ўрачы пакуль не спяшаюцца з выпіскай.

— Да выхадных урач казаў, што на здымку яшчэ ёсць прыкметы пнеўманіі. Пасля выхадных зноў зрабілі здымак і не адпусцілі — сказалі, што яшчэ трэба падлячыцца некалькі дзён.

Ад бацькі, пакуль той знаходзіўся дома, заразіліся і Вераніка, і яе маці.

— У панядзелак участковы ўрач прыходзіла да бацькі, у сераду — да мамы, а ў пятніцу выклікалі ўжо мне, — расказвае Вераніка. — Усе мы аказаліся на бальнічным. Пасля таго як у бальніцу трапіў тата, нам у паліклініцы зрабілі здымкі. У мяне было штосьці сярэдняе паміж бранхітам і пнеўманіяй. Прызначылі два антыбіётыкі і супрацьвірусны прэпарат флустоп. На той момант у мінскіх аптэках яго ўжо не было, брат набыў у Брэсце і перадаў нам.

Каля дзевяці дзён у Веранікі трымалася павышаная тэмпература, адчуваліся стамляльнасць і ламота ў целе, дзяўчына перастала адчуваць пахі і смак ежы. Пасля станоўчага тэсту ў бацькі аналізы на каранавірус узялі ва ўсёй сям'і. У дзяўчыны і яе маці яны пацвердзіліся, у маладога чалавека Веранікі былі адмоўныя. Ніякіх сімптомаў у яго таксама няма.

Дзяўчына адзначае, што сімптомы хваробы не падобныя на грып ці іншую рэспіраторную інфекцыю:

— Вельмі нязвыкла: ясі рыбу ці агурок — і не адчуваеш іх смаку. Разумееш толькі, салодкі ці салёны прадукт, — і ўсё. Нос бычцам і дыхае, але ніякіх пахаў не адчуваеш. Гэта іншы галаўны боль, чым пры грыпе. Ламота ў целе іншая — круціць неверагодна. Нягледзячы на тое што апошнімі днямі ў мяне амаль не павышаецца тэмпература, застаецца патлівасць: нічога не робіш — і раптам рэзка спацееш. Цяжка дыхаць — я дагэтуль не магу зрабіць поўны ўдых. Па вечарах заўсёды паднімалася тэмпература, звычайна да 37,5, я яе адчувала нават без градусніка. Праз дзень у мяне возьмуць другі тэст, і я мяркую, што ён будзе яшчэ станоўчы, бо цалкам я яшчэ не аднавілася, нягледзячы на тое што хварэю ўжо 19 дзён. Смак вярнуўся, а вось нюх — пакуль не зусім: моцныя пахі я адчуваю, а вось, скажам, адчуць пах гарбаты пакуль не магу. Напярэдадні застаецца жоўта-зялёнавага колеру — урач кажа, што лейкацыты пакуль не ў норме. У мамы, якая захварэла раней, чым я, дагэтуль трымаецца тэмпература.

Вераніка кажа, што ўчастковы доктар у паліклініцы з самага пачатку западозрыла каранавірус і дзейнічала адпаведна.

— Доктар запомніла ўсю нашу сям'ю. Апошні раз на прыёме яна сказала, што ў бацькі, хутчэй за ўсё, ілжываадмоўны тэст, і ў нас ва ўсіх каранавірусная інфекцыя, бо ўсе мы хварэем вельмі падобна. Потым тэсты толькі пацвердзілі яе здагадкі. Але ніякага дадатковага лячэння, акрамя бранхамуналу, мне ўжо не прызначалі, бо антыбіётыкі і супрацьвірусны прэпарат я прымала з самага пачатку.

Пасля станоўчага тэсту ўрач не прызначала прыёмаў, а штодзень тэлефанавала, пытала пра сімптомы і ўдакладняла, ці няма пагаршэнняў.

У пад'ездзе, дзе жыве сям'я, 20 кватэр, прычым у чатырох з іх ёсць хворыя на каранавірус, якія таксама цяпер лечацца дома. Многія працуюць у той жа будаўнічай арганізацыі, дзе і бацька Веранікі.

— Адзін з медыкаў сказаў нам, што вельмі важна, што бацьку шпіталізавалі своечасова. З гэтай інфекцыяй самае галоўнае — не згубіць час і як мага хутчэй пачаць лячэнне, — рэзюмуе Вераніка.

**Алена КРАВЕЦ.**

# У маі павышаюцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі

**Сярэдняя пенсія па ўзросце ў Беларусі ў лютым была роўная 446,70 руб.**

У Беларусі з 1 мая павышаюцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі пэўнага ўзросту, дапамогі па доглядзе інваліда І групы. Усе яны прывязаны да памеру бюджэту пражытачнага мінімуму.

Нагадваем, што сацыяльныя пенсіі прызначаюцца грамадзянам, якія не атрымліваюць працоўную пенсію: людзям з інваліднасцю, у тым ліку інвалідам з дзяцінства; дзецям — у выпадку страты карміцеля; дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў. А таксама мужчынам у 65 гадоў, а жанчынам — у 60 гадоў, калі яны не выпрацавалі мінімальны страхавы стаж.

Новыя памеры сацыяльных пенсій:

інвалідам І групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства, — 271,46 руб.;

інвалідам з дзяцінства ІІ групы — 234,44 руб.;

інвалідам ІІ групы, дзецям у выпадку страты карміцеля — 209,76 руб.;

інвалідам ІІІ групы — 185,09 руб.;

сацыяльная пенсія па ўзросце — 123,39 руб.;

дзецям-інвалідам да 18 гадоў пры ступені страты здароўя:

першай — 197,42 руб.;
другой — 209,76 руб.;
трэцяй — 234,44 руб.;
чацвёртай — 271,46 руб.

* * *

Таксама павялічацца дапамогі па доглядзе інваліда І групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту:

пры ажыццяўленні догляду адной асобы — 246,78 руб.;

пры ажыццяўленні догляду дзвюх і больш асоб — 296,14 руб.

* * *

Крыху павысяцца і даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі ўзросту 75 і 80 гадоў:

75 гадоў — 46,28 руб.;
80 гадоў — 61,70 руб.

# Бальнічны са стапрацэнтнай аплатай

**Бацькам, чыё дзіця адносіцца да кантактаў першага або другога ўзроўню па COVID-19, цяпер будуць выдаваць бальнічны ліст і выплачваць 100 % сярэднядзённага заробку.**

Раней было прынята рашэнне выдаваць ім даведку аб часовай непрацаздольнасці, якая служыла дакументам, што пацвярджае вызваленне ад работы, і не падлягала аплаце.

Цяпер у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паведамілі, што пунктам 15 Указа Прэзідэнта ад 24 красавіка 2020 года № 143 «Аб падтрымцы эканомікі» прадугледжана выплата дапамогі па часовай непрацаздольнасці асобам, што фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці да дзесяці гадоў, якое наведвае ўстанову дашкольнай або агульнай сярэдняй адукацыі. Пры гэтым неабходна, каб было выканана некалькі ўмоў. У прыватнасці, паўторым, дзіця павінна быць не большае за дзесяць гадоў, а таксама мець адзін або некалькі рэспіраторных сімптомаў. Другая ўмова: на бацькоў павінна распаўсюджвацца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, г. зн. яны ці іх работадаўца павінны выплачваць абавязковыя страхавыя ўзносы ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, перыяд знаходжання на лістку непрацаздольнасці па гэтым выпадку часовай непрацаздольнасці складае да 14 каляндарных дзён, памер аплаты складае 100 працэнтаў сярэднядзённага заробку з першага дня знаходжання на лістку непрацаздольнасці.

**Святлана БУСЬКО.**

Акцыя

# ПАМЯЦЬ, ЯКАЯ ЯДНАЕ

## У Магілёве аддалі даніну памяці абаронцам і вызваліцелям вобласці

Прысвечаная 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне рэспубліканская акцыя «У гонар агульнай Перамогі» адбылася на Буйніцкім полі — святым месцы для кожнага жыхара вобласці і краіны. Менавіта тут на працягу 23 дзён чырвонаармейцы і жыхары горада стрымлівалі шалёны націск наступаючай арміі вермахта і сваёй мужнасцю развеялі міф пра яе непераможнасць. Толькі за адзін дзень тут было падбіта і спалена 39 фашысцкіх танкаў і бронемашын. Ва ўрачыстай цырымоніі ўшанавання памяці герояў узялі ўдзел прадстаўнікі ўлады, ветэраны, дэпутаты, вайскоўцы, моладзь, грамадскасць.

— Пройдуць гады, зменіцца яшчэ не адно пакаленне, але ў сэрцах жыхароў Прыдняпроўскага краю захаваецца памяць аб подзвігу нашых прадзедаў, дзядоў і бацькоў, — адзначыў у сваёй прамове **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Немагчыма аддаць на забыццё тысячы спаленых вёсак, разбураных гарадоў, не схіліцца перад адвагай і гераізмам савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў. Акцыя «У гонар агульнай Перамогі» закліканая стварыць новую культуру памяці пра вайну і абараніць гістарычную праўду.

Загінулых герояў ушанавалі хвілінай маўчання, да падножжа капліцы былі ўскладзены кветкі і вянкі, а ў буйніцкім храме ў гонар Раства Іаана Прадцечы адбылася памінальная ліція.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**